

## 500-рублёвак адразу не будзе

СТАР. 4



## Марына ў тэатры і ў кіно

СТАР. 5



## Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 МАЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 89 (28199) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# НЯСУМНЫ САД



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінск. Мастачка на эцюдах у Лошыцкім парку.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Марына АРЦЁМЕНКА, намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Беларусь знаходзіцца сярод лідараў па працягласці водпуску па доглядзе дзіцяці. Аказанне падтрымкі пачынаецца з нараджэння дзіцяці і нават раней (комплекснае бясплатнае медыцынскае абследаванне, выплата дапамог па цяжарнасці і родах, прадастаўленне сацыяльнага водпуску). Такі працяглы водпуск па доглядзе дзіцяці — да 3 гадоў — сёння ёсць мала ў якіх краінах (Расія, Украіна, Казахстан). І не ва ўсіх іх ён аплачваецца ўвесь перыяд. Так, у РФ дапамога прызначаецца да спаўнення дзіцяці ўзросту 1,5 года, у Казахстане — да 1 года. У большасці ж краін адпачынак значна меншы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19234,00 | ▼ |
| Еўра | 21973,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 296,46 | ▲ |
| Укр. грыўня | 759,86 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Абітурыент-2016

## Трэнер па шахматах і спецыяліст па 3D-друку

### Якія новыя прафесіі прапануюць ВНУ?

**У 2016 годзе на ўсе формы навучання ў вышэйшыя навучальныя ўстановы плануецца прыняць больш за 63 тысячы чалавек — гэта лічба неістотна адрозніваецца ад леташняй. За кошт сродкаў бюджэту будуць атрымліваць адукацыю ў ВНУ каля 28 тысяч чалавек (з іх на дзённай форме навучання — 22,6 тысячы). Прыём на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі складзе прыкладна 32,6 тысячы чалавек, а ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы — каля 40 тысяч. Гэтыя лічбы агучыў на сустрэчы з журналістамі першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Вадзім БОГУШ.**

### Падрыхтоўка пад кадравыя патрэбы

Рабочая група з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў эканомікі, працы і сацыяльнай абароны, адукацыі, а таксама іншых ведамстваў вызначала кантрольныя лічбы набору ва ўстановы адукацыі з улікам кадравых патрэб эканомікі і дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне.

У ВНУ Міністэрства адукацыі набор на спецыяльнасці эканамічнага профілю скараціўся на 111 месцаў, на будаўнічы профіль — на 188, профіль «архітэктура» — на 28. Скарачэнне закранула таксама «філалогію» і «гісторыю» з прычыны невысокай запатрабаванасці спецыялістаў-гуманітарыяў. Затое на першы курс будуць набіраць больш настаўнікаў пачатковай школы і выхавальнікаў дашкольных устаноў (плюс 105 месцаў).

З-за змяншэння заявак скараціць набор на «лячэбную справу» ў медыцынскіх універсітэтах вырашыла і Міністэрства аховы здароўя, а вось у медыцынскіх каледжах набор, наадварот, павялічыўся. Таксама павялічылі кантрольныя лічбы набору ў сваіх ВНУ міністэрствы абароны і ўнутраных спраў...

Вадзім Богуш праінфармаваў журналістаў пра адкрыццё ў ВНУ шасці новых спецыяльнасцяў. Так, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт прапануе абітурыентам новую перспектыўную спецыяльнасць «вытворчасць вырабаў на аснове трохмерных тэхналогій». Акадэмія МУС пачне падрыхтоўку па спецыяльнасці «судовыя крыміналістычныя экспертызы». У Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры будуць рыхтаваць трэнераў па шахматах, а ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце — спецыялістаў па гісторыі і сусветнай мастацкай культуры, музычным мастацтве і сусветнай мастацкай культуры, гісторыі і экскурсійна-краязнаўчай рабоце, сацыяльнай і псіхолага-педагагічнай дапамозе.

СТАР. 3

■ Надвор'е

## ПАХАЛАДАЕ І ЗАЛЬЕ

### Ужо ў суботу сіноптыкі месцамі прагназуюць сур'ёзныя навальніцы і моцныя дажджы

**Начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў адзначае, што анамальная цеплыня ў першыя дні мая цяпер паціху адпускае. Сярэдняя тэмпература паветра яшчэ застаецца вышэйшай за кліматычную норму першай дэкады мая, аднак стала ўжо значна свяжэй.**



У пятніцу на тэрыторыі краіны будзе гаспадарыць зона паніжанага атмасфернага ціску, а ўдзень па паўднёва-заходняй палове адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу. Чакаецца пераменная воблачнасць. Удзень пераважна па паўднёва-заходняй палове Беларусі пройдуць дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер усходні, паўднёва-ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Максімальная тэмпература паветра складзе ад 16 да 22 цяпла. Атмасферны ціск будзе слаба падаць.

СТАР. 3

# ТРЫВАЛЫ ФУНДАМЕНТ ДВУХБАКОВАЙ ДРУЖБЫ

## Адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця комплексу будынкаў туркменскага пасольства з удзелам прэзідэнтаў Беларусі і Туркменістана

**Пасольства Туркменістана ў Беларусі павінна стаць цэнтрам беларуска-туркменскага супрацоўніцтва. Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на цырымоніі адкрыцця комплексу будынкаў туркменскага пасольства, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы лічыць глыбока сімвалічным, што ў знамянальны для ўсіх краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў, у тым ліку Туркменістана і Беларусі, дні святкавання Вялікай Перамогі адкрываецца ў цэнтры Мінска комплекс будынкаў пасольства брацкага Туркменістана. Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што паўтара года таму яны разам з Прэзідэнтам Туркменістана закладвалі капсулу ў фундамент будынка. А сёння ўжо ўзведзены аб'ект, які з'яўляецца архітэктурным упрыгажэннем сталіцы.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларуссю ўдзялялася максімум увагі на ўсіх этапах будаўніцтва комплексу. Гэта датычылася як устанаўлення адпаведных падатковых ільгот, так і стварэння інфраструктуры, добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі.

«Упэўнены, што пасольства стане цэнтрам прыцяжэння беларуска-туркменскага супрацоўніцтва. А дыпламаты, якія будуць тут працаваць, унясуць свой важкі ўклад ва ўмацаванне шчырай дружбы паміж нашымі народамі і дзелавога партнёрства паміж дзяржавамі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама падкрэсліў, што ў Беларусі вучыцца нямала туркменскіх студэнтаў, якія пасля вучобы павязуць з сабой часцінку беларускай душы і будуць у далейшым змацоўваць сваёй дзейнасцю беларуска-туркменскую дружбу. А аснова гэтай дружбы закладваецца ў Мінску.

«Безумоўна, гэтым дэманструецца ўзаемная ўпэўненасць у доўгатэрміновым характары двухбаковых адносін, нацэленасць на іх развіццё і паглыбленне. Тым больш што ў нас ёсць шэраг маштабных праектаў, рэалізацыя якіх паслужыць на карысць нашых краін», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы засяродзіў увагу на важнасці рэалізацыі буйных аб'ектаў, якія сумесна ўзводзяцца ў Туркменістане. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў супрацоўніцтве і ажыццяўленні сумесных праектаў няма вялікіх праблем. Але калі нават узнікаюць нейкія пытанні, яны своечасова вырашаюцца.

Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў адзначыў, што з туркменскага боку ёсць выразная нацэленасць на дасягненне канкрэтных высокіх вынікаў ва ўзаемадзеянні паміж Туркменістанам і Беларуссю. Кантакты дзвюх краін характарызуюцца шматграннасцю, чаму ў вялікай меры садзейнічае створаная значная дагаворна-прававая база.

# ГОРАД, ДЗЕ ПЕРАПЛЯЛАСЯ ГІСТОРЫЯ

## У Магілёве абмеркавалі план агульных дзеянняў па далейшым будаўніцтве Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі

**Насычанай стала праграма 45-га па ліку пасяджэння Савета міністраў Саюзнай дзяржавы з удзелам прэм'ер-міністраў Беларусі і Расіі Андрэя КАБЯКОВА і Дзмітрыя МЯДЗВЕДЗЕВА. Падчас сустрэчы было разгледжана 27 пытанняў. Былі абмеркаваны перспектывы беларуска-расійскага ўзаемадзеяння ад рэгіянальнага супрацоўніцтва да макраэканомікі.**

— Спадзяемся, што гэта сустрэча паслужыць далейшаму развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, — адзначыў беларускі прэм'ер. — Па выніках першага квартала 2016 года назіраюцца тэмпы росту тавараабароту паміж Расіяй і Беларуссю, долі ў знешнегандлёвых адносінах дзвюх дзяржаў павялічыліся.

У цэнтры ўвагі быў план мерапрыемстваў аб стварэнні дадатковых умоў для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. «Праца па пошуку агульных поглядаў будзе прадоўжана ў рамках дзейнасці спецыяльна створаных працоўных груп па напрамках», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

У ходзе пасяджэння ўхвалена падрыхтоўка сярэднетэрміновага прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Саюзнай дзяржавы. Абмеркавана праграма сумесных дзеянняў па перадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Разгледжаны канцэпцыі вядучых навукова-тэхнічных праграм Саюзнай дзяржавы. У прыватнасці праграмы «Аўтаэлектроніка», у рамках якой прадугледжана распрацоўка новага пакалення электронных кампанентаў для сістэм кіравання і бяспекі аўтатранспартных сродкаў спецыяльнага і двайнога прызначэння. Перспектыўная і праграма «ДНК-ідэнтыфікацыя», рэалізацыя якой намечана на 2016—2019 гады. Па гэтай праграме будуць распрацаваны сумесныя тэхналогіі крыміналістыкі і прафілактыкі сацыяльна-значных захворванняў. «Гэта дазволіць забяспечыць бяспеку грамадзян саюзнай дзяржавы і супрацьдзейнічаць тэрарызму», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Агавораны таксама план мерапрыемстваў па стварэнні агульнай інфармацыйнай прасторы да 2020 года. Рэалізацыя гэтага плана дазволіць сістэматызаваць інфармацыйную дзейнасць у Саюзнай дзяржаве і павысіць якасць тэматычных матэрыялаў.

— Мы вельмі сур'ёзна папрацавалі над двухбаковым парадкам дня і над тымі пытаннямі, якія датычацца Саюзнай дзяржавы, — адзначыў Дзмітрый Мядзведзеў. — Галоўныя застаюцца тры напрамкі: нарошчванне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, рэалізацыя сумесных буйных праграм, такіх як будаўніцтва АЭС, стварэнне навукова-тэхнічнай праграмы «Аўтаэлектроніка», сумесныя медыцынскія праграмы і духоўнае адзінства. Мы зацвердзілі палажэнне аб правядзенні алімпіяды сярод школьнікаў Саюзнай дзяржавы на тэму «Гістарычная і духоўная агульнасць».

Расійскі прэм'ер таксама адзначыў, што Магілёў — той горад, дзе перапляліся гісторыі Расіі і Беларусі. І яму было цікава тут пабываць. Дэлегацыі таксама наведалі Буйніцкае поле, дзе ў ліпені 1941-га плячом да пляча стаялі на абароне рубяжоў вялікай агульнай краіны нашы воіны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

Усебеларускі народны сход

# Сход выбірае... упаўнаважаных

**На Гомельшчыне праходзяць сходы, дзе выбіраюць упаўнаважаных ад працоўных калектываў. Яны на наступным тыдні будуць выбіраць дэлегатаў на пяты Усебеларускі народны сход.**

Усебеларускі сход дае магчымасць грамадзянам рэалізаваць канстытуцыйныя правы на ўдзел і абмеркаванне пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Ад Гомельшчыны на сход, які адбудзецца 22-23 чэрвеня, у Мінск паедзе 350 чалавек. Як чакаецца, асноўная ўвага будзе ўдзелена планам і задачам па рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на новую пяцігодку. На сход калектыву цэнтральнага апарату РУП «Гомельэнерга» прыйшлі рабочыя, кіраўнікі і служачыя вялікага прадпрыемства. Удзельнічалі ў ім і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Памочнік генеральнага дырэктара Аляксандр Казакоў нагадаў усім прысутным пра задачы, вызначаныя ў Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. У тым ліку пра тое, што сёлета мы павінны пераламіць і пераадолець усе негатыўныя тэндэнцыі ў эканамічнай сферы. На гарадскі сход ад буйнога прадпрыемства выбралі пяць чалавек. Кожны з іх мае свой пункт гледжання на далейшае развіццё краіны. Начальнік аддзела АСК РУП «Гомельэнерга» Юрый Пічуроў падкрэслівае, што напярэдадні чарговай пяцігодкі яму цікава даведацца пра шляхі рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны:

— Таксама для мяне вельмі важна, каб быці стабільнасць і мір на нашай зямлі. Толькі гэта дазволіць нам спакойна працаваць, нашым дзецям атрымліваць адукацыю, а старым людзям мець дастойную пенсію.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# ШТРАФЫ ЗА НАРКАТЫЧНАЕ АП'ЯНЕННЕ ІСТОТНА ПАВЯЛІЧАЦЦА,

## а дзеці-сіроты атрымаюць права на льготны крэдыт

## Дэпутаты разгледзелі 14 законапраектаў

**Падчас пасяджэння ў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў распачалася сапраўдная дыскусія з дакладчыкамі па законапраектах, што тычыліся гарантый па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, а таксама барацьбы з распаўсюджаннем наркотыкаў. Парламентарыі нават прапанавалі стварыць у краіне «прафілактычныя школы», якія вучылі б бацькоў, як даведацца, што іх дзіця ўжывае псіхатропныя рэчывы.**

— Сёння наша краіна можа ганарыцца сістэмай па абароне правоў дзяцей, у тым ліку дзяцей-сірот, і тых, што засталіся без нагляду бацькоў, — заявіла падчас размовы з журналістамі **Тамара КРАСОЎСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.**

Законапраект «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, што засталіся без нагляду бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без нагляду бацькоў» у асноўным закранае пытанні, якія тычацца ўрэгулявання праваадносін у жыллёвай сферы.

— Зменены тэрміны прадастаўлення жылля сацыяльнага карыстання для гэтай катэгорыі асоб: да 5 гадоў з моманту паўналецця, уступлення ў шлюб або да аднаго года з дня заканчэння вышэйшай навучальнай установы, — паведаміла дэпутат. — Па цяперашнім заканадаўстве адпаведны тэрмін складае 6 месяцаў з дня заканчэння навучальных установаў або заканчэння тэрміну ваеннай службы.

Праект закона дапоўнены нормай пра тое, што названая катэгорыя асоб мае права на атрыманне жыллёвага памяшкання ў інтэрнатах да атрымання жылля сацыяльнага карыстання.

— Гэта будзе іх права, — звярнула ўвагу дэпутат. — Абавязак мясцовых выканаўчых органаў — прадастаўляць такое жыллё.

Тамара Красоўская паведаміла, што праведзена карэкціроўка нормы, дзе і калі сіроты і асобы, што засталіся без нагляду бацькоў, маюць права стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў. Так, яны могуць зрабіць гэта па месцы атрымання першай працы або ў населеным пункце, дзе яны атрымалі статус сіраты. Гэтая ж катэгорыя грамадзян атрымлівае права на льготны крэдыт па паляпшэнні жыллёвых умоў. Дагэтуль у іх такога права не было.

— Гэта звязана з тым, што праз пяць гадоў сацыяльнае жыллё, прадастаўленае сіротам, пераходзіць у статус арэнднага, — патлумачыла Тамара Красоўская. — Права на льготны крэдыт будзе стымуляваць дзяцей вырашыць сваё жыллёвае пытанне, самім паклапаціцца пра ўласнае жыццё.

Закон уносіць і адно істотнае дапаўненне.

— Згодна з дзейным заканадаўствам, статус сіраты спыняецца па дасягненні маладымі людзьмі 23-гадовага ўзросту, — нагадала парламентарый. — Законапраект прадугледжвае гэты час. Калі маладыя людзі пасля 23 гадоў працягваюць навучацца на дзённай форме, то маюць права карыстацца тымі ж дабротамі, якімі карыстаюцца асобы, што маюць статус сіраты.

Апошні, па словах дэпутата, дае маладым людзям магчымасць атрымліваць розныя віды дапамогі.

Праект закона быў прыняты ў першым чытанні.

У першым чытанні дэпутаты прынялі папраўкі, якія ўстанаўліваюць адміністрацыйную адказнасць за з'яўленне ў стане наркатычнага ап'янення ў грамадскім месцы. Раней гэта парушэнне грамадскага парадку кваліфікавалася як з'яўленне ў нецвярозым стане і каралася адпаведна. Пасля ўступлення ў сілу законапраекта за ўжыванне наркатычных, псіхатропных рэчываў у немедыцынскіх мэтах будзе ўведзена асобная адказнасць.

**Васіль АЛЯКСЕЕНКА, член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы,** паведаміў, што за з'яўленне грамадзяніна ў стане наркатычнага ап'янення ў грамадскім месцы прадугледжаны штраф ад 5 да 10 базавых велічынь; на працы і ў працоўны час — ад 8 да 12 базавых. За спажыванне наркатычных сродкаў у грамадскім месцы прадугледжана адказнасць у памеры ад 10 да 15 базавых велічынь.

**Міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ,** які прысутнічаў на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў, паведаміў журналістам: у найбліжэйшай будучыні цалкам магчыма завядзенне крымінальных спраў у дачыненні да нашых грамадзян, якія прымалі ўдзел ва ўзброеных канфліктах за мяжой.

Па словах міністра, нядаўна прынятыя папраўкі ў заканадаўства, якія дазваляюць прыцягваць да адказнасці за ўдзел ва ўзброеных канфліктах за мяжой, а не толькі за найміцтва, павысяць у будучыні ўзровень бяспекі для жыхароў Беларусі. На яго думку, удзельнікі баявых дзеянняў за мяжой нясуць патэнцыяльную пагрозу для грамадзян.

— Я вывучыў іх біяграфіі, — паведаміў ён. — Многія з іх — вельмі экзальтаваныя асобы, якія маглі б у будучыні нарабіць нам бяды.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

**Анонс**

## Усё, што вы хацелі даведацца пра пенсіі

Ці павялічыцца перадпенсійны тэрмін, у які працадаўца не мае права не падоўжыць вам кантракт? Як будуць плаціць пенсію тым, хто працаваў за мяжой? Калі будуць выходзіць на пенсію ваенныя і міліцыя? Якая выслуга гадоў зараз будзе патрэбна дзяржслужачым? На гэтыя і іншыя пытанні вам адкажуць **спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі — начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння ДРОНАВА Алена Уладзіміраўна і кансультант упраўлення пенсійнага заканадаўства САМАДУМСКАЯ Аляксандра Віталеўна** — падчас «прамой лініі», якая адбудзецца ў «Звяздзе» **19 мая з 11.00 да 12.00.**

**Тэлефануйце:**
**8 (017) 287-18-71**

***Папярэднія пытанні (з пазнакай «Прамая лінія») можна дасылаць на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.***

## ПРАМАЯ СУВЯЗЬ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У гэтую суботу ўжо традыцыйна адбудуцца тэлефонныя лініі

Такая сувязь улады з жыхарамі краіны арганізавана даўно, яна працуе ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

**У гэтую суботу, 14 мая, на сувязь выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
ТОКАР Мікалай Васілевіч — першы намеснік старшыні (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
ШАРСТНЁЎ Мікалай Мікалаевіч — старшыня (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна — кіраўнік справамі (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
ЖУК Ігар Георгіевіч — старшыня Савета дэпутатаў (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
ІСАЧЭНКА Анатоль Міхайлавіч — старшыня Савета дэпутатаў (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
МАРКЕВІЧ Іван Станіслававіч — кіраўнік справамі (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
КУХАРАЎ Уладзімір Яўгенавіч — першы намеснік старшыні (80172224444).

# Трэнер па шахматах і спецыяліст па 3D-друку


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Крытэрыі адбору

Як падкрэсліў Вадзім Богуш, **мінулагоднія падыходы да парогавых значэнняў на ЦТ былі захаваныя**. Нездавальняючымі адзнакамі па беларускай і рускай мовах будуць лічыцца балы ад 0 да 9. Выключэнне складаюць толькі некаторыя філалагічныя спецыяльнасці, па якіх для таго, каб удзельнічаць у конкурсе, трэба будзе набраць не менш як 20 балаў.

Калі матэматыка, фізіка, хімія, біялогія з'яўляюцца першай профільнай дысцыплінай, то нездавальняючымі прызнаюцца адзнакі ад 0 да 14 балаў. Станоўчым вынікам лічацца 15 балаў і больш. Калі тыя ж дысцыпліны з'яўляюцца другім профільным іспытам, то планка патрабаванняў зніжаецца і абітурыенту дастаткова будзе набраць усяго 10 балаў (нездавальняючымі лічацца ад 0 да 9 балаў).

Калі першай профільнай дысцыплінай з'яўляюцца гісторыя Беларусі, сусветная гісторыя найноўшага часу, грамадазнаўства, геаграфія і замежныя мовы (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская), нездавальняючымі лічацца балы ад 0 да 19. Калі гэта другая профільная дысцыпліна, то трэба будзе набраць не менш як 15 балаў, каб быць дапушчаным да ўдзелу ў конкурсе.

Самыя нізкія парогавыя значэнні ўстаноўлены для абітурыентаў, якія будуць сёлета паступаць у ВНУ Мінабароны, МНС, Дзяржпагранкамітэта, на ваенныя факультэты грамадзянскіх ВНУ, а таксама ў вышэйшыя навучальныя ўстановы па групах спецыяльнасцяў «Вытворчасць, захоўванне і перапрацоўка прадукцыі раслінаводства», «Жывёлагадоўля. Рыбаводства. Пчалярства», «Сельскае будаўніцтва і ўладкаванне тэрыторый», «Меліярацыя і водная гаспадарка» і «Аграінжынерыя».

**Многія ўніверсітэты пайшлі шляхам стварэння асабістых кабінетаў абітурыента. Гэта практыка хоць і не адмяняе візіт у прыёмную камісію, але значна скарачае час падачы дакументаў.**

Для таго, каб удзельнічаць у конкурсе, ім дастаткова будзе набраць усяго 5 балаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Руская мова», «Матэматыка», «Фізіка», «Хімія», «Біялогія», «Гісторыя Беларусі», «Сусветная гісторыя найноўшага часу», «Грамадазнаўства», «Геаграфія» і «Замежныя мовы». Такія ж балы ўстаноўлены і для абітурыентаў ВНУ Міністэрства ўнутраных спраў, але толькі для тых, хто будзе паступаць у рамках дадатковага набору.

## Асабістыя кабінеты

У параўнанні з папярэднім годам на адзін дзень сёлета былі скарочаны тэрміны прыёму дакументаў на бюджэтную форму навучання: прыёмныя камісіі чакаюць абітурыентаў з 8 па 14 ліпеня. А з 15 ліпеня распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: для асоб, якія паступаюць як за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

**Тэрміны залічэння на «бюджэт» наступныя:**

па 22 ліпеня — на дзённую і завочную формы атрымання адукацыі ў ВНУ сілавых ведамстваў;

па 28 ліпеня — на дзённую і завочную формы атрымання адукацыі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

па 24 ліпеня — на вочную і завочную формы атрымання адукацыі ў іншых дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі (акрамя завочнай формы атрымання адукацыі ў сельскагаспадарчых ВНУ);

па 20 снежня — на завочную форму атрымання адукацыі ва ўстановах вышэйшай адукацыі сельскагаспадарчага профілю.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы (дадатковы набор) у большасці ВНУ будзе весціся тры дні: з 26 па 28 ліпеня, у «творчых» ВНУ — з 29 па 30 ліпеня, у ВНУ «сілавых» ведамстваў з 24 па 26 ліпеня. Залічэнне ў лік студэнтаў пройдзе не пазней за 31 ліпеня. У ВНУ сілавых ведамстваў — па 27 ліпеня.

Пакуль што абітурыенты не могуць падаваць дакументы ў ВНУ дыстанцыйна праз інтэрнэт, канстатаваў Вадзім Богуш. «Заява ад абітурыента павінна быць падпісана ім самім асабіста альбо гэты дакумент падаецца даveранай асобай ва ўстаноўленым парадку, — патлумачыў ён. — Пытанне ўкаранення дыстанцыйнай сістэмы падачы дакументаў звязана з пашырэннем электроннага дакументаабароту ў краіне. Я мяркую, што як толькі гэта пытанне будзе вырашана, то і сістэма адукацыі даволі аператыўна зможа перайсці да такой формы». У той жа час, паводле яго слоў, многія ўніверсітэты пайшлі шляхам стварэння асабістых кабінетаў абітурыента. Гэта практыка хоць і не адмяняе візіт у прыёмную камісію, але значна скарачае час падачы дакументаў.

## Лёсавызначальная субота

Вадзім Богуш запрасіў усіх абітурыентаў прыняць удзел ва «Універсітэцкай субоце», якая адбудзецца 14 мая ў Палацы спорту ў Мінску. Удзел у гэтым прафарыентацыйным мерапрыемстве возьмуць усе ўніверсітэты, акадэміі і інстытуты. Магчыма, для кагосьці яно стане штуршком, які дапаможа канчаткова вызначыцца з выбарам прафесіі і навучальнай установы.

Падчас інтэрактыўнай прафарыентацыйнай выстаўкі кожны наведвальнік зможа азнаёміцца з экспазіцыямі ўстаноў вышэйшай адукацыі, даведацца аб перавагах навучальнай установы і перспектывах працаўладкавання пасля заканчэння вучобы. На экспазіцыі будуць працаваць таксама і кансультацыйныя пункты Міністэрства адукацыі. Спецыялісты ўпраўленняў пракансультуюць аб правілах і асаблівасцях паступлення і залічэння, дадуць рэкамендацыі па выбары прафесіі. Будуць арганізаваныя інтэрактыўныя тэматычныя пляцоўкі, забаўляльныя і спартыўныя мерапрыемствы, майстар-класы...

Плануецца, што на пляцоўцы Ваеннай акадэміі будзе прадстаўлены ваенны аўтамабіль, Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт збіраецца выставіць рэанімабіль. На пляцоўцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі разгорнецца сапраўдны тэлецэнтр, дзе плануецца здымаць ток-шоу. БДЭУ правядзе экспрэс-дыягностыку «Пазнай сябе», а Інстытут пагранічнай службы рыхтуе выступленне групы па рукапашным баі.

Не менш цікавым для навучэнскай моладзі абяцае стаць і II Нацыянальны чэмпіянат WorldSkills Belarus — 2016 па рабочых прафесіях, дзе будуць прадстаўлены 35 кампетэнцый. Спаборніцтвы пройдуць з 17 па 19 мая ў сталіцы ў Футбольным манежы. Сваё прафесійнае майстэрства пакажуць 258 удзельнікаў: навучэнцы прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, а таксама маладыя рабочыя ва ўзросце да 22 гадоў. У Футбольным манежы будуць дзейнічаць інтэрактыўныя прафарыентацыйныя пляцоўкі «Усе грані прафесіі», разлічаныя на падлеткаў, якія яшчэ толькі вызначаюцца з прафесійным выбарам. Да таго ж у рамках II Нацыянальнага чэмпіянату пройдуць і першыя спаборніцтвы «JuniorSkills Беларусь». Сусветны рух JuniorSkills скіраваны на прыцягненне ўвагі дзяцей і моладзі да свету прафесій.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Актуальна

# ЛЕТНЯЯ ШКОЛА СУСТРАКАЕ ГАСЦЕЙ

### У Інстытуце журналістыкі БДУ падчас XI Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні» прайшлі заняткі ў фармаце летняй школы журналістыкі

**Будынак на Кальварыйскай ужо адзінаццаты раз сабраў прафесіяналаў журналісцкай справы для перадачы ведаў студэнтам. Здаецца, зімовая школа журналістыкі толькі скончылася, і вось зноў гучаць прыветныя словы і пажаданні плённай працы ад дырэктара Інстытута журналістыкі Сяргея ДУБОВІКА. Намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матусевіч таксама прывітаў гасцей летняй школы:**



— Наша мерапрыемства ўжо стала традыцыйным, але разам з тым застаецца актуальным. Магчымасць абмену вопытам вельмі каштоўная, бо сённяшняя інфармацыйная прастора развіваецца імкліва. Згодна з данымі сацыялагічных даследаванняў, у 2005 годзе 3% ад усіх апытаных назвалі інтэрнэт як прыярытэтную крыніцу інфармацыі, а ў 2015 годзе гэтая лічба дайшла да 45%. Як у гэтых умовах працаваць друкаваным СМІ, як выкарыстоўваць у сваёй працы інтэрнэт, сацыяльныя сеткі і вялікую колькасць гаджэтаў, з якімі не разлучаецца значная колькасць людзей, — вось толькі частка пытанняў, якія трэба абмеркаваць.

Пра асаблівасці сваёй працы расказалі студэнтам генеральны дырэктар Беларускага тэлеграфнага агенцтва Дзмітрый Жук, дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Арменпрэс» Арам Ананян, дырэктар кыргызскага нацыянальнага інфармацыйнага агенцтва «Кабар» Кубанычбек Таабалдзіеў і кіраўнік сектара краін СНД і Балтыі «ТАСС» Барыс Грушын. Пасля заўвагі Дзмітрыя Жука пра тое, што журналіст павінен быць цікаўным, атрымаўся сапраўдны дыялог, бо аўдыторыя пачала задаваць кіраўнікам інфармацыйных агенцтваў шмат пытанняў.

Студэнты таксама змаглі паўдзельнічаць у майстар-класах вядучых журналістаў Беларусі і краін Еўразіі.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■


Фота Надзеі БУЖАН.

■ Факт

# СЯРОД НАЙЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ

Прадпрыемствы нашай краіны прадставілі сваю прадукцыю на буйной спецыялізаванай выставе прадуктаў харчавання «SIAL CHINA 2016» у Шанхаі. На сваіх стэндах айчынныя вытворцы прадэманстравалі мясныя далікатэсы, паўфабрыкаты, прадукты з птушкі, розныя віды сыроў, масла, малако, хлебабулачныя вырабы. Выстаўка з'яўляецца адной з найбуйнейшых у свеце і праводзіцца ў Шанхаі з 2000 года. У мерапрыемстве прымае ўдзел каля 2900 экспанентаў з больш як 70 краін. Плануецца, што на працягу трох дзён работы выставу наведаюць каля 80 тысяч чалавек.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

# ВЫРАТАВАЛІ З БАЛОТА

У сталіцы ратавальнікі дасталі мужчыну, які захрас у балоце.

Выклік у цэнтр аператыўнага ўпраўлення Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС паступіў позна ўвечары: у балоцістай мясцовасці на тэрыторыі Лошыцкага прысядзібна-паркавага комплексу захрас чалавек, патрэбна дапамога. Ратавальнікі знайшлі і дапамаглі выбрацца на бераг мужчыне 1968 года нараджэння, які знаходзіўся на глыбіні ў метр на адлегласці 400 метраў ад праезнай часткі. Пацярпелага шпіталізавалі з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

# ПАХАЛАДАЕ І ЗАЛЬЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Не абяцаюць паляпшэння надвор'я сіноптыкі і ў выхадныя. Так, 14 і 15 мая над тэрыторыяй краіны завіснуць маларухомыя атмасферныя франты. Максімальна надвор'е сапсуецца менавіта ў суботу, калі на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі будуць адзначацца навальніцы і ліўні. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе складаць ад 6 да 13 цяпла, максімальная ўдзень — да плюс 13—20 градусаў, а месцамі паветра прагрэецца да 23 цяпла. Далейшае пахаладанне і ападкі прагназуюцца і ў нядзелю. Паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Уначы і раніцай месцамі згусціцца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 цяпла, а ўдзень будзе плюс 12—19 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, халаднавата і вільготна будзе і ў першыя дні наступнага тыдня. Чакаецца, што тэмпература паветра ўдзень у панядзелак і аўторак можа знізіцца да 12—16 цяпла, і толькі па поўдні краіны прагназуецца да плюс 18 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Фінансавая палітыка

# ІНФЛЯЦЫЮ ЗАЦУГЛЯЮЦЬ



**Нацыянальны банк Беларусі працягне курс на абмежаванне інфляцыі і забеспячэнне фінансавай стабільнасці, заявіў днямі старшыня праўлення Нацбанка Павел КАЛАУР, калі каментаваў вынікі 500 дзён працы праўлення рэгулятара ў цяперашнім складзе.**

Кіраўніком Нацбанка было адзначана, што паводле вынікаў І квартала сёлета прамежкавы арыенцір манетарнай палітыкі — прырост шырокай грашовай масы — знаходзіцца ў межах устаноўленых параметраў. Аднак дынаміка інфляцыі за акрэслены час склалася вышэйшая за прагнозную траекторыю: прырост спажывецкіх цэн за 3 месяцы года склаў 5,7 працэнта супраць прагнозных 5%.

Перавышэнне фактычнага ўзроўню гадавой інфляцыі над мэтавым паказчыкам звязана з кароткатэрміновым усплёскам інфляцыі ў пачатку года ў сілу адміністрацыйнага павышэння цэн і кароткатэрміновага дзеяння курсавога фактару. Улічваючы разавы характар уздзеяння названых чыннікаў, інфляцыйныя працэсы будуць мець тэндэнцыю да запавolення. Паводле ацэнак Нацыянальнага банка, у чэрвені тэмпы інфляцыі будуць значна зніжаны, што дазволіць наблізіцца да 12 працэнтаў па выніках года.

**Адразу пасля дэнамінацыі Нацбанк не плануе задзейнічаць 500-рублёвую купюру ў шырокім грашовым абарачэнні. Такая купюра будзе выдавацца па запыце грамадзян праз банкі.**

Эксперты Нацбанка адзначаюць, што істотны ўплыў на эканамічныя працэсы ў краіне сёлета па-ранейшаму аказвала дынаміка абменнага курсу беларускага рубля. У цэлым за студзень—сакавік аслабленне беларускага рубля да кошыка валют склала 12,7%. Пры гэтым асноўнае зніжэнне абменнага курсу нацыянальнай валюты — на 11,4% — прыпала на студзень, калі на фоне хуткага аслаблення расійскага рубля сфарміраваўся чысты попыт на замежную валюту з боку суб'ектаў гаспадарання і насельніцтва на ўнутраным валютным рынку.

## Курс — на рэнтабельнасць экспарцёраў

Паводле ацэнкі старшыні праўлення Нацбанка, за 500 дзён новая каманда аказыцыявіла дзеянні па ліквідацыі назапашаных дысбалансаў, інфляцыйных і дэвальвацыйных чаканняў, а фінансавыя рынкі былі прыведзены да дынамічнай раўнавагі.

Павел Калаур звярнуў увагу, што кантроль за грашовымі агрэгатамі разам з іншымі антыінфляцыйнымі мерамі спрыяе абмежаванню інфляцыі. «Выкарыстанне механізму гнуткага курсаўтварэння павысіла адаптыўнасць эканомікі да змен вонкавых фактараў, адначасова аднавіўшы цэнавую канкурэнтаздольнасць айчынных экспарцёраў. Сёння абменны курс беларускага рубля забяспечвае дастатковую рэнтабельнасць экспарцёраў», — дадаў ён.

Сярод планаў Павел Калаур назваў у першую чаргу аднаўленне даверу да манетарнай улады. Непасрэдна ў частцы грашова-крэдытнай палітыкі гэта абмежаванне інфляцыі і забеспячэнне фінансавай стабільнасці разам з умацаваннем даверу да нацыянальнай грашовай адзінкі.

## Доля «таксічных» пазык — пад кантролем

«Што тычыцца прагнознай дынамікі праблемных актываў нашых прадпрыемстваў, то сітуацыя гэта пакуль кіруецца. Праведзеныя намі і міжнароднымі фінансавымі інстытутамі абследаванні і стрэс-тэсты паказваюць магчымы рост праблемных даўгоў, аднак гэтая сітуацыя не крытычная», — адзначыў Павел Калаур. Ён нагадаў, што ўрадам рэалізуецца блок захадаў па фінансавым аздараўленні эканомікі, у тым ліку па рэструктурызацыі, рэарганізацыі, санацыі прадпрыемстваў і, як крайняя мера, банкруцтва.

Акрамя таго, Нацбанкам сумесна з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі і аўдытарскімі кампаніямі праводзіцца работа па выяўленні схаваных рызык, адэкватнай класіфікацыі актываў і стварэнні «падушкі бяспекі» ў выглядзе спецрэзерваў банкаў. Акрамя гэтага, банкамі самастойна праводзяцца мерапрыемствы па павышэнні якасці крэдытнага партфеля.

«Для зняцця вастрыні праблем Нацыянальным банкам і ўрадам унесены адпаведныя ініцыятывы па частковай ачыстцы балансаў банкаў ад «дрэнных» (ці «таксічных») актываў. Гэтая ініцыятыва заключаецца ў тым, што ў краіне павінна быць створана спецыяльнае агенцтва па працы з праблемнымі актывамі, а таксама працягнуты крокі па перадачы асобных «таксічных» актываў Банку развіцця», — растлумачыў Павел Калаур. Паралельна з уласнікамі банкаў Нацбанк разглядае пытанне аб дакапіталізацыі банкаў, дзе гэта неабходна. Як паведамлялася, доля праблемных актываў банкаўскага сектара на 1 красавіка 2016 года дасягнула 11,5%, што аказвае негатыўны ціск на фінансавы вынік і капітал банкаў.

Праблема крэдытнай рызыкі вырашаецца ў ходзе сумесных абмеркаванняў з удзелам Нацыянальнага банка, урада, камерцыйных банкаў і найбуйнейшых крэдытаатрымальнікаў. Большасці прадпрыемстваў, якія сутыкнуліся з праблемай пагаршэння фінансавага стану, банкі аказалі дапамогу ў рэфінансаванні запазычанасці і перараазмеркаванні пазыковай нагрузкі, зыходзячы з патокаў паступлення выручкі.

«Разам з тым абмежаваць крэдытныя рызыкі толькі за кошт банкаўскага сектара не ўяўляецца магчымым. Для недапушчэння пагаршэння паказчыкаў дзейнасці банкаў неабходна ўрэгуляваць праблему крэдытаў, якія не абслугоўваюцца, забяспечыць актыўнае выкарыстанне механізму санацыі жыццяздольных структур і выводзіць з рынку «хранічна» неэфектыўных прадпрыемстваў», — падкрэсліў у Нацбанку.

## Пошук інвестараў

Павел Калаур пацвердзіў інфармацыю аб планах краіны па продажы акцый Беларусбанка ў памеры менш за 25%. Пры гэтым кіраўнік Нацбанка звярнуў увагу, што гэтае пытанне будзе вывучаць спецыяльна створаная працоўная група і рашэнне аб продажы канкрэтнага пакета акцый яшчэ не прынята.



**Першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка Тарас НАДОЛЬНЫ** адзначыў, што «ініцыятыў ад моцных знешніх інвестараў пакуль не відаць». Паводле яго слоў, пры выбары пакупніка гэтага пакета акцый краіна будзе арыентавацца на фінансавага гульца, здольнага прыўнесці ў банкаўскую сферу новыя тэхналогіі. Не выключана, што гэта можа быць і еўрапейскі інвестар, аднак будуць вывучацца ўсе прапановы.

Як паведамлялася, урадам створана рабочая група для каардынацыі дзеянняў па рэалізацыі мінарытарнага пакета акцый Беларусбанка. Рабочай групе даручана ўзгадніць з ААТ «ААБ Беларусбанк» умовы адкрытага конкурсу па выбары фінансавага кансультанта па пытаннях рэалізацыі мінарытарнага пакета акцый банка, а таксама конкурсную дакументацыю па яго выбары. Сярод іншага працоўнай групе неабходна ўзгадніць папярэднюю ацэнку кошту акцый Беларусбанка, падрыхтаваць і да 1 лістапада 2017 года ўнесці ва ўрад Беларусі прапановы аб выбары пакупніка мінарытарнага пакета акцый банка.

## А Хоум Крэдыт Банк рэарганізуецца



**Намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Дзмітрый ЛАПКО** паведаміў, што Хоум Крэдыт Банк стане нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыяй. Рашэнне аб гэтым было прынята ўласнікам 2 мая. Нацбанк праінфармаваны аб тых дзеяннях, якія ажыццяўляе ўласнік Хоум Крэдыт Банка. Паводле слоў Дзмітрыя Лапко, гэта асабістая справа ўласніка, у якой форме будзе весціся бізнес — у статусе банка або нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі.

Хоум Крэдыт Банк зарэгістраваны Нацыянальным банкам Беларусі 10 ліпеня 2002 года. Памер яго статутнага фонду складае амаль 144,8 млрд рублёў. Як паведамлялася, Хоум Крэдыт Банк з 1 красавіка спыніў выпуск і абслугоўванне банкаўскіх картак, а яго зарплатны праект перайшоў да Белінвестбанка.

## 500 новых рублёў будуць, але не адразу

Таксама Дзмітрый Лапко адзначыў, што падрыхтоўка да дэнамінацыі ў Беларусі выканана ўжо на 90%. Намеснік старшыні праўлення Нацбанка канстатаваў, што ўсе падрыхтоўчыя мерапрыемствы ідуць па плане. Пры гэтым ён звярнуў увагу, што пераход на новыя грошы не будзе аднамомантавым — для гэтага ёсць адпаведны пераходны перыяд. Купюры старога і новага ўзору будуць знаходзіцца ў паралельным абарачэнні на працягу шасці месяцаў пасля дэнамінацыі. «І не трэба чакаць, што з 1 ліпеня ўсе банкаматы і ўсе касы банкаў пяройдуць на новую грашовую адзінку. Пры гэтым мы арыентуем банкі, каб яны былі гатовыя з 1 ліпеня максімальна хутка гэты працэс запускаць», — дадаў Дзмітрый Лапко.

Паводле рэкамендацыі Мінгандлю, многія крамы ўжо цяпер пачалі пазначаць цэны ў старых і новых грашах.

А вось купюр у 200 і 500 рублёў новага ўзору пасля дэнамінацыі ў шырокім абарачэнні на першапачатковым этапе не будзе. Аднак Дзмітрый Лапко адзначыў, што Беларусь не плануе адмаўляцца ад увядзення новай купюры наміналам 500 рублёў на фоне таго, што Еўрапейскі цэнтральны банк вырашыў спыніць у 2018 годзе выпуск купюр наміналам 500 еўра. Разам з тым адразу пасля дэнамінацыі Нацбанк не плануе задзейнічаць 500-рублёвую купюру ў шырокім грашовым абарачэнні. «Такая купюра будзе выдавацца па запыце грамадзян праз банкі», — сказаў ён.

## Аптымальны аб'ём ЗВР складае 10 млрд долараў

Старшыня Нацбанка ўпэўнены, што пры такім аб'ёме (10 млрд USD) золатавалютных рэзерваў наша краіна магла б разлічваць і на больш нізкія працэнтныя стаўкі пры прыцягненні крэдытаў на знешніх рынках. «Нейкі аптымальна-мінімальны ўзровень, на які наша краіна павінна была б арыентавацца, — 10 млрд долараў. Гэты ўзровень задавальняў бы рэйтынгавых агенцтвы, крэдытораў і дазваляў бы краіне пазычаць на знешніх рынках па меншых працэнтных стаўках, чым робіцца гэта цяпер», — адзначыў Павел Калаур.

«Але гэта не значыць, што краіна не можа жыць збалансавана пры меншым узроўні золатавалютных рэзерваў. 10 млрд — гэта лічба, пры якой знешнія крэдыторы ацэньвалі б краіну з меншымі рызыкамі», — падкрэсліў старшыня праўлення Нацбанка.

Як паведамлялася, па выніках красавіка золатавалютныя рэзервы Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду павялічыліся на 37,1 млн долараў і, паводле папярэдніх звестак, на 1 мая склалі 4,2 млрд долараў у эквіваленце.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Пытальнік

# «СТАЖ БОЛЬШ ЗА 40 ГАДОЎ. ЧАМУ ТАКІ МАЛЫ ПАМЕР ПЕНСІІ?»

**Пачынаю пісаць гэты зварот да чыноўнікаў, але пакуль не ведаю, каму яго адрасаваць. Справа ў тым, што вось пайшоў другі год, як я не працую, і трэці — як на пенсіі. Больш не далі працаваць, хоць заўваг не было, я быў брыгадзірам на помпавай станцыі ў Любанскай ПМС. Як толькі перастаў працаваць, стаў, можна так сказаць, «жабраком». Добра, каб я працаваў, як той казаў, праз пень-калоду. Усё сваё працоўнае жыццё я шчыра адпрацаваў, ніводнага дня не прагуляў. Я атрымаў пенсію за 42 гады стажу: каэфіцыент 0,5, а гэта 1 мільён 470 тысяч рублёў. Ёсць знаёмыя мужыкі, якія апошнія 17-20 гадоў увогуле не працавалі, а атрымалі пенсіі больш за два мільёны. Самі работнікі сацзабеспячэння былі здзіўленыя, але ўсё было па законе...»**

**Мікалай Іванавіч НІЗКІ,**
*вёска Рэдкавічы Любанскага раёна.*

Насамрэч ліст нашага чытача нашмат большы. Мікалай Іванавіч падрабязна распавядае пра сваю працоўную біяграфію, якую распачаў яшчэ навучэнцам, пералічвае месцы службы і працы, пасады, што займаў. Гэтак жа падрабязна пералічвае заахвочванні і ўзнагароды, якія атрымаў за гэтыя доўгія гады працы (і нават даслаў ксеракопіі грамат)... Адказ на запыт вяскоўца з **упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Любанскага райвыканкама**, куды мы звярнуліся ў пошуках адказу на пытанне заяўніка адносна малога памеру яго пенсіі, такі ж грунтоўны і падрабязны. Як і ліст чытача, даём яго са скарачэннямі.

«...Вы знаходзіцеся на ўліку ва ўпраўленні і атрымліваеце пенсію па ўзросце з 16.10.2013 года пры агульным стажы 41 год 9 месяцаў 19 дзён і індывідуальным каэфіцыенце заробку 0,54115. Для разліку індывідуальнага каэфіцыента ўзяты аптымальны варыянт заробатнай платы за 19-гадовы перыяд працы з 01.11.1984 года па 30.11.2003 года з апошніх 29-ці гадоў працы перад зваротам за прызначэннем пенсіі з кастрычніка 1984 года па кастрычнік 2013 года згодна з артыкулам 57 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні»...

Тлумачым, што, у адпаведнасці з артыкулам 56 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні» (далей — Закон), пенсіі налічваюцца па ўстаноўленых нормах у працэнтах да адкарэкціраванага ў сувязі з ростам сярэдняй заробатнай платы работнікаў у рэспубліцы фактычнага заробку, які грамадзяне атрымлівалі перад зваротам па пенсію.

Пры гэтым заробак не больш за 130 працэнтаў заробатнай платы работнікаў у рэспубліцы, выкарыстаны для карэкціроўкі фактычнага заробку пенсіянера, у межах 10 працэнтаў указанай велічыні ўлічваецца цалкам, а ў межах кожных наступных 10 працэнтаў — адпаведна ў памеры 90, 80, 70, 60, 50, 40, 30, 20, і 10 працэнтаў...

Памер вашай пенсіі ў красавіку 2016 года склаў 2 120 200 рублёў. У тым ліку:

— асноўны памер 55 працэнтаў (за стаж працы ў 25 гадоў) ад вашага заробку 2 698 449 рублёў (апускаем алгарытм налічэння апошняга. — **Аўт.**) складае 1 484 146,95 рубля;

— даплата да пенсіі ў мінімальным памеры на падставе пастановы Савета Міністраў №1976 ад 22.12.1999 года — 112 793 рублі;

— працэнт павелічэння пенсіі за перавышэнне стажу (артыкул 23 Закона) 10 працэнтаў (за 10 гадоў стажу звыш 25 гадоў) ад вашага заробку ў 2 698 449 рублёў складае 269 844,90 рубля;

— працэнт павелічэння пенсіі за перавышэнне стажу на 5 гадоў (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №570) ад 35 гадоў да 40 гадоў складае... 207 714,54 рубля... за перавышэнне стажу на 1 год... звыш 40 гадоў... складае... 45 697,20 рубля.

Такім чынам, памер пенсіі ў красавіку 2016 года роўны 2 120 200 рублям. Пенсія прызначана і выплачваецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні».

Звяртаем вашу ўвагу, што пры асабістым звароце ва ўпраўленне вам можа быць аказана матэрыяльная дапамога ў выпадках цяжкай жыццёвай сітуацыі: прычыненне шкоды здароўю і (ці) маёмасці ў выніку стыхійных бедстваў (пажараў, засух, паводак і іншых), тэхнагенных катастроф, крадзяжоў асабістай маёмасці, узнікнення іншых сітуацый, якія аб'ектыўна парушаюць нармальную жыццядзейнасць і складаныя для самастойнага вырашэння, патрабуюць аператыўнага аказання матэрыяльнай дапамогі. Такога кшталту дапамога вам аказвалася ў маі 2015 года ў памеры 1 300 000 рублёў для рамонту даху пасля ўрагану».

**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# КІНО — ДЛЯ ЖЫЦЦЯ, ТЭАТР — ДЛЯ ДУШЫ

## Зорка тэлесерыялаў Марына ДЗЯНІСАВА — пра перавагі творчай прафесіі, жаночае шчасце і выдаткі папулярнасці



**Можна казаць, што Марына шчаслівая жанчына, якая змагла рэалізаваць свой акцёрскі талент на ўсе 100%. Яна працуе на тэатральных пляцоўках, здымаецца ў кіно, выкладае ва ўніверсітэце культуры. Фільмы з яе ўдзелам не сыходзяць з тэлеэкранаў. Апошнія два серыялы, дзе яна знялася, — «Дом для лялькі» і «Скрадзенае шчасце» — «круцілі» па тэлебачанні ў мінулым месяцы. На гэтым тыдні ў тэлепраграму трапілі «Сіла Веры» і «Мянтоўскія войны». За апошнія некалькі гадоў яна сыграла амаль з паўсотні розных роляў у кіно. Не пакідаючы пры гэтым тэатральныя падмосткі. Наша з ёй сустрэча адбылася якраз падчас маладзёжнага тэатральнага форуму «Март-кантакт» у Магілёве. У спектаклі Таццяны Траяновіч «Ілюзіі» яна выконвае адну з галоўных роляў.**

***— Вы так часта здымаецеся ў расійскіх серыялах, што некаторыя, напэўна, думаюць, вы — расійская актрыса.***

— Сапраўды, у мяне часта пытаюцца: вы што, прыехалі да нас адпачываць? Я адыграла ў Мінску шмат сур'ёзных тэатральных роляў, удзельнічала ў цікавых тэатральных праектах, але чамусьці вядомасць мне надалі менавіта расійскія тэлесерыялы. Хоць лічу свае тэатральныя работы больш важкімі і плённымі, чым кінематаграфічныя. Год таму яшчэ працавала ў тэатры Беларускай арміі, а цяпер я — вольны мастак.

***— А з чаго пачыналася ваша творчая кар'ера?***

— Пасля мінскай Акадэміі мастацтваў увесь наш курс узялі ў Драматычны тэатр імя М.Горкага як эксперыментальны. Аркадзь Кац з маскоўскага тэатра «Ля Нікіцкіх варот», які прыязджаў тады да нас, нешта разглядзеў ва мне і адзінай з усяго нашага курса даверыў галоўную ролю ў сваёй пастаноўцы «Сунічная паляна» паводле Інгмара Бергмана. Уяўляеце, я, выпускніца акадэміі, працавала ў пары з самім Расціславам Янкоўскім. Гэта было для мяне вялікім гонарам.

Пасля драматычнага тэатра, з якога мне прыйшлося сысці, некалькі гадоў прысвяціла тэатру Беларускай арміі. Тады я выйшла замуж, а жыць не было дзе. І я наўпрост звярнулася да міністра абароны (на той момант гэта быў Леанід Мальцаў, з яго ініцыятывы, дарэчы, і быў створаны тэатр) з просьбай дапамагчы. Нам далі блок у інтэрнаце, дзе мы пражылі 6 гадоў: 2 пакоі з санвузлом, але без кухні. Замест яе — маленькая плітка. Але мы былі ўдзячныя і за гэта. На той час здымаць кватэру нам было проста не па кішэні. А ў кіно я пачала працаваць ужо пасля таго, як нарадзіўся сын Раман.



**«Крыху расчаравалася ў Аляксею Серабракове. Па кіно я ўяўляла яго сабе мужным, моцным мужчынам, а ў жыцці ён здаўся мне крыху ныцікам. Магчыма, у яго быў дрэнны настрой».**

***— Ваш муж таксама акцёр?***

— Дзякуй Богу, не *(смяецца)*. Аляксандр Бондараў — дызайнер інтэр'еру і мэблі. Ён мастак у трэцім пакаленні. Вельмі таленавіты. Мы пазнаёміліся ў Акадэміі мастацтваў, калі былі студэнтамі. Дарэчы, менавіта ён даў мне магчымасць здымацца ў кіно. Мяне запрасілі на галоўную ролю ў серыял «Помста», які здымаў сын Расціслава Янкоўскага — Уладзімір, вельмі таленавіты рэжысёр. А паралельна я працавала ў фільме «Другое жыццё Фёдара Строгава». Абедзве стужкі здымаліся ў Мінску. Потым пачаліся паездкі, пералёты — цяжка было.

***— А як жа сям'я?***

— Падчас здымак сына амаль не бачыла. Едзеш на працу каля 7 раніцы, вяртаешся каля 23. Муж 4 гады свайго жыцця паклаў на маю кар'еру. Дзякуй яму вялікі за падтрымку. Не кожны на гэта здольны. Жонка — актрыса, прыходзілася здымацца і ў «цікавых» сцэнах. Трэба разумець, што ты цалуешся ў кадры не таму, што вельмі хочацца, а таму, што так у сцэнарыі напісана. Не дзеля задавальнення, а каб карцінка атрымалася. Муж ставіўся да гэтага з разуменнем. Мы ніколі не сварыліся. Але год таму зразумелі, што пачуцці паміж намі перагарэлі, і развяліся пасля 10 гадоў сумеснага жыцця. Цяпер проста пра гэта казаць, а тады было вельмі балюча. Калі разышліся, нават не ўсе мае сябры разумелі гэты разрыў. Мы расталіся сябрамі. Сыну патлумачылі, што ў гэтым няма ніякай трагедыі, і цяпер у яго 2 дамы замест аднаго.

***— Эканамічны крызіс неяк паўплываў на вашу запатрабаванасць у кінематаграфічным працэсе?***

— Раней галоўных роляў было больш. Зараз ёсць праца, але расіяне сталі менш да нас прыязджаць, і аплата ўпала разоў у 5. Былі праекты, калі я зарабляла за месяц гадавы заробак. Напрыклад, серыял «Ікраны барон». У мяне там была галоўная роля — жонкі алігарха. Здымкі ішлі ў Піцеры. А паралельна здымалася ў «Снайперы» ў Мінску. Часам ехала ў Піцер наўпрост з акопаў, з абадранымі пазногцямі — не было часу прывесці сябе ў парадак. У мяне быў такі дзяжурны чамадан, які мне прывозіў муж, і я ляцела з ім у расійскую паўночную сталіцу. Па дарозе ў аэрапорт пераапраналася ў чыстае адзенне, а бруднае муж вёз дамоў. Трэба было бачыць, якімі вачыма глядзелі на мяне тыя жанчыны, якія ляцелі са мной у самалёце. У Піцеры мяне адмывалі, манікюрылі, марафецілі, а пасля здымак я ўся напамаджаная зноў ляцела ў свае акопы. І такі рэжым захоўваўся паўтара месяца. Было цяжка, пастаянныя пералёты, стомленасць дзікая, немагчымасць сустрэцца з блізкімі і сынам. Часу хапала толькі на тое, каб пачысціць зубы, памыцца і легчы спаць. І вывучыць кучу тэкстаў. Не паверыце, але ў гэтыя моманты дзікай стомленасці я раптам лавіла сябе на думцы: якая я ўсё ж такі шчаслівая.

***— А было жаданне кінуць тэатр дзеля кіно?***

— Я люблю кіно, але жыць не магу без тэатра, без гэтых жывых зносінаў. Такая практыка вельмі важная. Адсутнасць дубля, калі ўсё можна паўтарыць. Тут і зараз — у цябе няма права на памылку. Тэатр, які мне падаравала Таня Траяновіч, дае рэалізавацца ўсім акцёрскім амбіцыям. Мы разам вучыліся ў акадэміі, я ведаю яе не першы год. Усе яе спектаклі, пачынаючы ад студэнцкіх, былі яркімі, на злобу дня, праўдзівымі, дакладнымі. Калі яна паклікала мяне, я сказала, што згодна, і нават чытаць тэкст не буду. Не пашкадавала ні аднаго разу.

***— Вы гатовы ісці на любыя эксперыменты ў мастацтве?***

— На любыя. Зараз з Таццянай Траяновіч рэпецыруем новы спектакль «Румыны». Там шмат ненарматыўнай лексікі, і для мяне спачатку гэта было шокам. Але, калі разумееш, для чаго гэта, усё ў парадку. Галоўнае, не скаціцца ў пошласць. Чалавек павінен бачыць, што ён не адзінокі ў сваёй бядзе, што ёсць святло ў канцы тунэля. Як пасля нашых «Ілюзій». У некаторых людзей пасля спектакля жыццё мянялася. Яны падыходзілі і казалі пра гэта.

Мастацтва павінна натхняць. Памятаю, як пасля фільма «Сіла Веры» мне прыйшоў ліст з Расіі на 7 старонках. Мужчына напісаў пра суседку, у якой з мужам не было дзяцей — спачатку не хацелі, потым не атрымалася. А вось паглядзелі кіно, пайшлі ў дзіцячы дом і ўсынавілі дзіця. Я рыдала над гэтым лістом. Вось сэнс маёй працы.

***— Шмат хто з творчых людзей, каб рэалізавацца, з'язджае ў Расію. Не збіраецеся браць з іх прыклад?***

— Мне так і кажуць: трэба ехаць з краіны, цяпер крызіс. А я не хачу. Тут я атрымала адукацыю, сустрэла свайго мужа, нарадзіла сына. Я хачу ганарыцца сваёй краінай, прынесці ёй карысць. Хачу, каб мяне называлі менавіта беларускай актрысай. Я патрыёт.

**«Мы ніколі не сварыліся. Але год таму зразумелі, што пачуцці паміж намі перагарэлі, і развяліся пасля 10 гадоў сумеснага жыцця. Цяпер проста пра гэта казаць, а тады было вельмі балюча».**

***— Даводзілася чуць, што артысты настолькі ўваходзяць у вобраз сваіх герояў, што гэта потым адбіваецца на іх жыцці.***

— Калі ты іграеш на поўным сур'ёзе, прапускаеш цераз сябе, такое непазбежна. У мяне так было некалькі разоў, калі я здымалася паралельна ў серыялах «Сіла Веры» і «Ой, мамачкі». Нейкія падобныя сімпатыі, тыпажы пераносіліся ў рэальнасць. Я пачынала лавіць сябе на думцы, што я гэта ўжо перажывала. А потым зразумела: з цябе адразу ўсё не выходзіць, ты працягваеш іграць тую ж ролю у жыцці — паводзіны, успрыманне, сітуацыі застаюцца на тваёй падкорцы. Нават тэксты са сцэнарыяў. Калі матэрыял добры, чаму б не скарыстацца ім у жыцці. Тыя ж «Ілюзіі» для мяне сталі адкрыццём.

***— На здымачнай пляцоўцы вашымі партнёрамі былі вядомыя артысты. Якія ўражанні засталіся ад зносінаў з імі?***

— Раіса Разанава — першая расійская зорка, з якой я здымалася. Яна дзіўная. Увесь час падтрымлівала мяне, тлумачыла. У нашых інстытутах рыхтуюць акцёраў тэатра, а ў кіно свая спецыфіка. Гэтаму прыходзіцца вучыцца ў працэсе здымак. Цікавая заканамернасць: чым больш таленавіты твой партнёр па пляцоўцы, тым ён прасцейшы. А вось маладыя часцей за ўсё з «пантамі».

Крыху расчаравалася ў Аляксею Серабракове. Па кіно я ўяўляла яго сабе мужным, моцным мужчынам, а ў жыцці ён здаўся мне крыху ныцікам. Магчыма, у яго быў дрэнны настрой, але тых цудоўных уражанняў ужо няма. Аляксандр Дамагараў падаўся мне мужчынам з сіндромам стомленай зоркі. А вось Дзіма Іосіфаў (той самы Бураціна) акрамя таго, што вельмі ўдумлівы і таленавіты рэжысёр, яшчэ і чалавек вялікай душы. Здымацца ў яго — адно задавальненне.

***— Ці прыходзіцца адчуваць адмоўныя бакі папулярнасці?***

— Чым больш вядомым становішся, тым часцей да цябе стукаюцца людзі, якіх не ведаеш. Былі выпадкі, калі нейкім чынам даведваліся адрас маёй пошты і дасылалі вельмі агідныя рэчы. Я прынцыпова не агаляюся ў кадры. Хачу, каб усё было эстэтычна і прыгожа. Прашу на замену дублёра. Але бывае, калі я знаходжуся на адпачынку, нейкія незнаёмыя людзі пачынаюць мяне фатаграфаваць. Гэта вельмі нервуе. Я не разумею: навошта? Кампрамат збіраецеся сабраць? А яшчэ не люблю, калі незнаёмыя людзі мне «тыкаюць». Гэта, лічу, элементарная непавага.



***— А крытыку як успрымаеце?***

— Хваравіта *(усміхаецца)*. Хоць заўсёды прыслухоўваюся. Але, як казаў Пушкін: «Хулу и похвалу приемли равнодушно...» Я навучылася не цешыць сябе, калі хваляць. І не адчайвацца, калі лаюць. Хапае людзей, якія пішуць: куды ты лезеш, паглядзі на сябе. Гэта сапраўды балюча. А вось канструктыўная крытыка толькі дапамагае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**




# БАСЭТЛЯЙ ЗАРАБІЎ НА РУЛІ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» — тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Басэ́тля** — струнны смычковы інструмент, кантрабас. *У Аляксея Зарыцкага чытаем:*

*Зварыла вясна прываротнае*
*зелле.*
*Без бубна было, без басэтлі*
*вяселле.*

**Кі́чка** — святочны галаўны ўбор замужняй жанчыны. *Ад старажытнарускага кіка. Яна была ў выглядзе адкрытай кароны, упрыгожаной рознымі каштоўнымі камянямі.*

**Рулі́** — страва, прыгатаваная з накрышанага ў малако ці ў ваду хлеба. *«Накрышы ў міску хлеба, нарэж цыбулі, гуркоў, налі расолу. Вось будуць рулі!» — пісаў Максім Лужанін.*

**Аль́яс** — расліна з тоўстымі прадаўгаватымі калючымі лістамі. *Тая самая расліна алоэ. «На вокнах, як і раней, стаяў рагаты калючы альяс», — чытаем у Петруся Броўкі.*

**Самапа́сам (прысл.)** — без нагляду, на свабодзе. *«На... [лузе] ўсю вясну, лета і восень самапасам пасвяцца гусі», — чытаем у Барыса Сачанкі.*

**Кулём (разм., прысл.)** — вельмі хутка, імкліва. *Паляцець кулём з гары. Кінуцца кулём за кім-небудзь. Па-руску скажам «кубарем».*

**Перабіраць костачкі** — 1) абгаворваць каго-небудзь, распаўсюджваць плёткі. 2) дэталёва, падрабязна абмяркоўваць каго-небудзь, што-небудзь. *Беларускія адпаведнікі: мянціць языком, перамываць костачкі. Рускі: молоть языком. Якуб Колас у «Новай зямлі» пісаў:*

*Лясніччы новы не з'явіўся,*
*А ўжо, як трэба, уявіўся...*
*Ну, адным словам, адчыталі,*
*Усе косці пану перабралі...*

**Як па пісаным** — 1) бойка, гладка, без запінкі гаварыць. 2) так, як планавалася, без нечаканасцяў. *Беларусы яшчэ скажуць: як па нотах, як рэпу грызці. Рускія: как по маслу.*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожнай суботы.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## ■ Шайбу!

# ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА ХАКЕІ — 2016 У РАДЫЁЭФІРЫ

**З 6 па 22 мая ў Маскве і Санкт-Пецярбургу праходзіць чэмпіянат свету па хакеі. Сачыць за трансляцыямі матчаў і развіццём падзей можна не толькі ў эфіры трох тэлеканалаў, але і ў радыёэфіры — на хвалях Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё.**

Галоўны радыёканал краіны сумесна з тэлеканалам «Беларусь 5» прадстаўляе слухачам прамыя радыётрансляцыі заключных перыядаў матчаў зборнай Беларусі па хакеі. У прыватнасці, 17 мая ў 17.40 адбудзецца гульня Беларусь — Францыя.

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё можна слухаць па правадной сетцы ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі, на ўльтракароткіх хвалях, у FM-дыяпазоне і ў рэжыме рэальнага часу ў інтэрнэце на сайце radio1.by і ў лічбавым стандарце DVB-T.

Дзе б вы ні знаходзіліся, зможаце не прапусціць спаборніцтва любімай каманды ■

## Панядзелак, 16 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 13.05 Меладрама «Анюціна шчасце».**
**14.45 Камедыя «Праведнік разнаскурых».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.00 Серыял «Сваты-3».**
**17.50** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.30** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**0.30** Дзень спорту.
**0.40 Серыял «Цікаўная Варвара 2».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.20, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**10.55** Азбука смаку.
**11.30** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**12.00 Серыял «Класная школа».**
**13.05 Серыял «Косці».**
**16.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія — Нарвегія.
**18.25** Капейка ў капейку.
**19.15** Суперлато.
**20.05** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**22.05** КЕНО.
**22.10** Рэпарцёр.
**23.05 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**0.05 Серыял «Быць чалавекам».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 11.35, 18.45, 21.00** «Калейдаскоп».
**7.55, 19.50 «Майстар і Маргарыта». Драма.**



**8.45** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**9.40** «Наперад у мінулае».
**10.05** «Наваселле». Кароткаметражны фільм.
**10.35, 21.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.10** «Музеі Беларусі». Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Віцебскі мастацкі музей.
**11.55** «Гарадок кавальскіх майстроў». Дак. фільм.
**12.20 «Нябёсы запаветныя». Трагікамедыя.**
**14.20, 21.50** «Час кіно».
**14.30 «Прыгоды маладога пана». Прыгоды.**
**16.30** «Выпуск напярэдадні вайны». Дак. фільм.
**16.55 «Балада пра салдата». Драма.**
**18.20, 23.20** «Дыя@блог». Пра літаратуру.
**19.05** «Гарачае лета 1968 года». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**22.00 «Мёд асы». Драма.**
**23.50** «Геапалітыка: свет за тыдзень».
**На тэлеканале «Беларусь 3» па Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай вобласці з 16 па 20 мая 2016 года на працягу адной гадзіны будуць трансляваецца абласныя тэлепраграмы:**
**панядзелак, аўторак, пятніца — з 18.50 па 19.50;**
**серада, чацвер — з 18.45 па 19.45.**

### Беларусь 5

**7.10** PRO спорт. Навіны.
**7.20** Хакей. Чэмпіянат свету. Германія — ЗША.
**9.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Славакія — Фінляндыя.
**11.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Швецыя.
**13.05, 23.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**13.25** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**15.05** Час футбола.
**15.50** Хакей. Чэмпіянат свету. Дзённік.
**16.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада — Францыя.
**18.25** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Мінск» — «Тарпеда БелАЗ» (Жодзіна). (**У перапынку** — PRO спорт. Навіны).
**20.25** Хакей. Чэмпіянат свету. Германія — Венгрыя.
**22.30** PRO спорт. Вынікі.
**23.25** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Дзяўчаты. U-17. Фінал.

### СТБ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Адваротны адлік». «Цырк па-савецку. Гастролі без страхоўкі».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Маст. фільм «Чорнае мора».**
**0.15** Начныя навіны.

### АНТ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05** «Такі лёс».
**14.50** «Канцэрт Міхаіла Задорнава».
**15.55** «Часткі свету».
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тайны Чапман».
**23.55 Маст. фільм «Высокая мода».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30 Серыял «Галіна».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Няма праблем».
**13.45 Маст. фільм «Добры дзень для вяселля».**
**15.30** «Справы сямейныя».
**16.20** «Народы Расіі».
**17.20 Серыял «Бацька Мацвей».**
**19.20 Серыял «Трохі не ў сабе».**
**21.05 Маст. фільм «Тата напракат».**
**22.55 Серыял «Апантаны».**
**23.55** Ток-шоу «Слова за слова».
**0.45 Маст. фільм «Адзіная».**
**2.25** — *Прафілактыка на тэлеканале.*

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.40** «Уся Расія».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «МУР».**
**19.10, 20.50 Серыял «Вярні маё каханне».**
**21.55, 23.10 Серыял «Міндальны прысмак кахання».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Таптуны».**
**15.00 Серыял «Аддзел 44».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Пёс».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**

### 8 канал

**7.00, 14.15, 20.00, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30, 20.05 Серыял «Тыран».**
**8.15 Камедыя «Брыльянтавая рука».**
**10.00, 14.00, 15.45, 16.45, 18.40, 19.50, 20.55** «Хатняя крама».
**10.15 Трылер «Джанга».**
**13.00 Серыял «Крах».**
**14.20 Серыял «Нашчадкі».**
**16.30** «Кінабпакнот».
**16.55 Серыял «Захоп».**
**18.50 Серыял «Забі і вылечы».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Англійскі пацыент».**

### ВТБ

**6.00, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30, 17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Парарo».
**8.00, 13.30** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны 3».
**9.30, 14.00** Серыял «Апошні з Магікян 5».
**10.30** «Кіно ў дэталях».
**11.30** Фантастыка «Направалом».
**15.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.00** «Лаві момант».
**19.00** Серыял «Беглыя сваякі».
**20.00** Серыял «Вечны водпуск».
**21.10** Фэнтэзі «Сямейка Адамс».
**23.30, 3.30** Серыял «Выжыць пасля 2».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15** «Мужнасць». Маст. фільм.
**12.25** «Лінія жыцця». Уладзімір Гасцюхін.
**13.20** Шэдэўры старога кіно. «Меерхольдаўцы ў кіно. Усевалад Меерхольд». «Белы арол». Маст. фільм.
**14.40, 1.30, 2.40** Сусветныя скарбы.
**15.10** «Міхаіл Булгакаў. Чорны снег». Фільм першы.
**15.40** «Тэатральны раман». Маст. фільм.
**17.30** Тыдзень фартэпіяннай музыкі.
**18.50** Да 160-годдзя дзяржаўнага музея. «Траццякоўка — дар бясцэнны!» «Аляксандр Іваноў».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.20** «Захоўваюць так шмат дарагога, або Эрдман і Суяпанава: двайны партрэт у інтэр'еры эпохі». Дак. фільм.
**22.15** «Тым часам».
**23.00** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Кіно народаў Расіі. «Етэган». Маст. фільм.
**0.50** «Астравы». Мікалай Алялін.

### Настальгія

**6.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. 2010 год.
**6.55, 8.35, 11.20, 12.40, 16.00, 18.30, 20.40, 21.40, 23.00, 0.45, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** «Зямля—Паветра». Група «Ночные снайперы». 2003 год.
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «Блакітныя маланкі».
**12.00** «Акулы пяра». Васіль Шумаў.
**13.05** «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год.
**15.00** Маст. фільм «Ішоў сабака па раялі».
**17.00** «Філасофія лёсу».
**18.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Раман Карцаў.
**19.00** Маст. фільм «Волга-Волга».
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 1-я частка.
**1.00** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год. Канцэрт Канстанціна Нікольскага.
**1.40** Маст. фільм «Ні пуху, ні пер'я!»
**4.00** «Колба часу».

### EuroSport 1

**5.00, 8.30, 14.30, 17.45, 23.15** Веласпорт. Тур Каліфорніі.
**6.00, 9.30** Веласпорт. Джыра. Агляд падзей.
**7.00** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**10.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**11.30, 16.15** Скачкі ў ваду. Чэмпіянат Еўропы.
**11.55** «Гісторыі спартсменаў».
**12.00, 17.00, 18.45** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы.
**15.15, 2.45** Веласпорт. Джыра-д'Італія.
**18.30** «Найлепшае з коннага спорту».
**22.00** «Дарога да золата».
**23.00** Тэніс. Рыхтуйся да «Ралан Гарос».
**2.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**2.30** Watts.

### Камедыя

**0.40** «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець». Камедыя.
**2.40** «Вакол свету за 80 дзён». Камедыя.
**4.40** «Камедыянты. Найлепшае».
**5.20** «Ас з асаў». Камедыя.
**7.10** «Поспехаў, Чак!» Меладрама.
**8.55** «Блеф». Камедыя.
**10.35** «Школа зладзеяў». Камедыя.
**12.20** «Школа зладзеяў 2». Камедыя.
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** «10 дзён каб закахацца». Меладрама.
**17.45** «Круты татачка». Камедыя.
**19.30** «Усё як мае быць!» Камедыя.
**21.20** «Купі, пазыч, украдзі». Камедыя.
**23.10** «Я вяртаюся да мамы». Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.10** «Доктар І...».
**7.40, 18.55, 1.05** «Падарунак лёсу». Серыял.
**9.30, 2.45** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.20, 3.35** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.20** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**12.15** «Без падману».
**13.00** «Бой з ценем». Баявік.
**15.10** «Каменская». Серыял.
**16.05** «Хатні рэстаран».
**17.00** «Бляск і галеча савецкіх манекеншчыц». Дак. фільм.
**17.55** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**20.55, 0.20** «М.У.Р». Серыял.
**21.50** «Я ведаю твае сакрэты». Серыял.
**22.45, 4.25** «Развітанне».
**23.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**5.10** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 18.05** «Змоўшчыца». Драма.
**8.15, 4.00** «Страчаны рай». Трылер.
**10.25, 2.15** «Прынцэса Манака». Драма.
**12.15** «Даю год». Меладрама.
**14.00** «Кухар на колах». Камедыя.
**15.55** «Яна». Меладрама.
**20.10** «Прылады смерці: горад касцей». Фэнтэзі.
**22.25** «Паганіні: скрыпач д'ябла». Драма.
**0.30** «Снежань». Драма.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** «На гульні». Баявік.
**8.20, 2.20** «Артыстка». Меладрама.
**10.20, 4.20** «Гідраўліка». Драма.
**12.20** «Балі Валтасара, ці Ноч са Сталіным». Драма.
**14.20** «Развод па ўласным жаданні». Меладрама.
**16.10** «Піянеры-героі». Трагікамедыя.
**20.20** «Ключ ад спальні». Камедыя.
**22.45** «9 дзён і адна раніца». Драма.
**0.20** «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна». Дэтэктыў.

### National Geographic

**6.00, 13.35** Гульні розуму.
**6.50** Зрабі або памры.
**7.15, 13.10, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 17.50** Космас. Прастора і час.
**8.30, 18.40** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**9.15, 14.00, 19.25** Падземны свет майя.
**10.00, 14.45, 20.10** Даследчык 2.0.
**10.50** Незвычайныя промыслы.
**11.40** Сапраўдны суперкар.
**12.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**15.30** На плытах па Юкане.
**16.20** Сіла племені.
**17.05, 21.00, 0.50, 4.00** Супербудаванні Трэцяга рэйха.
**21.45, 1.40, 4.40** Напад нацыстаў на ЗША.
**22.30** Уварванне на Зямлю.
**23.20, 2.25** Эвакуацыя Зямлі.
**0.05, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00** Разбуральнікі легенд.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Паляўнічыя на склады.
**11.00, 1.00, 7.10** Вострaў.
**12.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**13.00, 6.20** Загадкі планеты Зямля.
**15.00, 5.30** Хуткія і гучныя.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Аляска: сям'я з лесу.
**19.00** Паездка ўлегцы.
**20.00** Футбол 360.
**22.00** Выжыць разам.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**0.00** Паляўнічыя на атруту.
**2.00, 4.40** Багажныя войны.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Серада, 18 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**9.10, 22.05 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 15.25 Серыял «Айцец Мацвей».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Серыял «Дыверсант. Канец вайны». Заключная серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.50** Дзень спорту.
**1.00 Серыял «Цікаўная Варвара 2». Заключная серыя.**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 16.15 Трылер «Закрытая школа».**
**10.10** «Разбуральнікі міфаў».
**11.20** Я хачу гэта ўбачыць!
**11.55, 17.25 Серыял «Варонiны».**
**13.30, 19.00 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**14.30** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**19.55** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**21.30** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.45** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Фінал.
**0.15 Серыял «Быць чалавекам».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 13.15, 18.45, 21.00** «Калейдаскоп».
**7.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.00, 19.45 «Майстар і Маргарыта». Драма.**
**8.50** «Святыні Беларусі». Пaрафія Узвышэння Святога Крыжа г. Баранавічы.
**9.20 «Кніга джунгляў». Прыгоды.**
**11.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці дырыжора, кампазітара, народнага артыста СССР Іосіфа Жыновіча.
**11.30 «Мінін і Пажарскі». Драма.**
**13.35 «Прынцэса-паўлін». Казка.**
**15.05** «Кавалеры рэк, балот і лясоў». Дак. фільм.
**15.20** «Славянскі базар-2012». Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля народнага танца імя І. Маісеева.
**16.50 «Тайны мадам Вонг». Прыгоды.**
**18.20, 23.15** «Дыя@блог». Пра прыгожае.
**19.05, 21.15** «Мужчыны на ве шляху». Аляксандра Каланталі.
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Ворагі». Драма.**

### Беларусь 5

**7.20, 18.45, 22.55** PRO спорт. Навіны.
**7.30, 21.05** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**9.15** Хакей. Чэмпіянат свету. Чэхія — Швейцарыя.
**11.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Расія — Швецыя.
**13.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**13.20** Тэніс. Турнір WTA. Рым. Фінал.
**15.25** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Мінск» — «Тарпеда БелАЗ» (Жодзіна).
**17.20** «Місія — Рыа». Відэачасопіс.
**17.55** Спорт-кадр.
**18.25** Козел пра футбол.
**18.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Першы матч.
**20.35** Слэм-данк.
**23.05** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір у Пекіне.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Таблетка».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Маргарыта Назарава».**
**22.55** «Гарады-героі». Севастопаль.
**23.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.00** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.35** «Вадзіць па-рускy».
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.50** «Разумней не прыдумаеш з Міхаілам Марфіным».
**0.45 «Мяжа часу». Серыял.**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00, 5.30** «Культпрасвет».
**9.30 Маст. фільм «Адзіная».**
**11.05, 0.30 Маст. фільм «Башмачнік».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Вой, мамачкі!»
**13.45, 19.20 Серыял «Трохі не ў сабе».**
**15.30, 3.20** «Справы сямейныя».
**16.20, 2.25** «Народы Расіі».
**17.20 Серыял «Бацька Мацвей».**
**21.05 Маст. фільм «Той, хто гасіць святло».**



**22.40 Серыял «Апантаны».**
**23.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**3.45** «Рэальнае ўсынаўленне».
**4.10 Маст. фільм «Прыватнае жыццё Пятра Вінаградава».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.30** «Бясплоддзе. Пракляцце чалавечае». «Прыгоды цела. Выпрабаванне перагрузкай».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 22.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Таптуны».**
**15.00 Серыял «Аддзел 44».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Пёс».**
**22.35** «Вынікі дня».
**23.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**

### 8 канал

**7.00, 14.15, 19.45, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.30 Серыял «Тыран».**
**8.20, 9.25, 14.00, 15.45, 16.20, 18.00, 19.40, 20.55** «Хатняя крама».
**8.25, 18.10 Серыял «Забі і вылечы».**
**9.30 Серыял «Пад купалам».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Баявік «Мурашка».**
**13.00 Серыял «Крах».**
**14.20 Серыял «Нашчадкі».**
**16.35 Серыял «Захоп».**
**19.10** «Мой любімы гадаванец».
**19.50 Серыял «Робат».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Дзікія гісторыі».**
**23.05 Серыял «Плашч».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.20** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны 3».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Беглыя сваякі».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Вечны водпуск».
**11.30** Камедыя «Спытайце ў Сіндзі».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «Дзюплекс».
**23.30, 3.30** Серыял «Выжыць пасля 2».
**0.30, 3.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Каломба». Серыял.
**12.25, 23.00** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**12.55** «Красуйся, горад Пятроў!» «Дойлід Васіль Стасаў».
**13.20** Шэдэўры старога кіно. «Меерхольдаўцы ў кіно. Сяргей Марцінсон». «Новыя прыгоды Швейка». Маст. фільм.
**14.45, 1.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**15.10** «Міхаіл Булгакаў. Чорны снег».
**15.40** Штучны адбор.
**16.20** «Даніна захаплення. Соф'я Піляўская». Дак. фільм.
**17.05** «Цэнтр кіравання «Крым». Дак. фільм.
**17.50** Тыдзень фартэпіяннай музыкі.
**18.40** «Фрэнсіс Бэкан». Дак. фільм.
**18.50** Да 160-годдзя дзяржаўнага музея. «Траццякоўка — дар бясцэнны!» «Ісак Левітан».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.20** «Рэгтайм, або Разарваны час. Андрэй Сахараў».
**22.15** Улада факта. «Імперыя Аляксандра І».
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Кіно народаў Расіі. «Першае каханне». Маст. фільм.
**1.00** «Астравы». Мікалай Досталь.

### Настальгія

**6.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Раман Карцаў.
**6.30, 8.40, 9.40, 11.00, 13.00, 14.20, 15.40, 17.00, 19.00, 20.40, 21.40, 23.00, 0.40, 4.00** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Волга-Волга».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Дыктары». 2006 год.
**13.20** Маст. фільм «Вяселле».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар: Вераніка Доліна. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Цырк».
**23.15** «Я сама». Тэма: «Вось я і дамаглася свайго». 1995 год.
**0.00** «Акулы пяра». Васіль Шумаў.
**1.05** «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год.
**3.00** Маст. фільм «Ішоў сабака па раялі».

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 11.30, 18.45, 2.00** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы.
**5.00, 8.30, 0.00** Веласпорт. Тур Каліфорніі.
**6.00, 10.15, 23.00** Веласпорт. Джыра. Агляд падзей.
**9.30, 11.15, 22.45** Тэніс. Рыхтуйся да «Ралан Гарос».
**9.45** Аўтаспорт. Серыя Renault.
**10.45** Барацьба. Алімпійскі кваліфікацыйны турнір.
**13.45, 15.30, 2.30** Веласпорт. Джыра д'Італія.
**15.15, 18.30** Веласпорт. Джыра экстра.
**22.15** Тэніс. «Ралан Гарос». Кваліфікацыя.

### Камедыя

**0.30** «Поспехаў, Чак!» Меладрама.
**2.20** «Блеф». Камедыя.
**4.00** — Прафілактыка на тэлеканале.
**10.05** «Камедыянты. Найлепшае».
**10.30** «Круты татачка». Камедыя.



**12.10** «Усё як мае быць!» Камедыя.
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** «Купі, пазыч, украдзі». Камедыя.
**17.50** «Я вяртаюся да мамы». Камедыя.
**19.25** «Праект «А». Камедыя.
**21.15** «Кахаю тваю жонку». Камедыя.
**23.00** «Былыя: лепшыя сябры!» Камедыя.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І...».
**8.20, 18.55, 1.00** «Падарунак лёсу». Серыял.
**10.00, 3.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.50, 4.15** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.50, 16.00** «Хатні рэстаран».
**12.45** «Магія прыгажосці».
**13.40** «Тайныя знакі».
**14.35** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Каменская». Серыял.
**17.00, 21.45** «Я ведаю тваё сакрэты». Серыял.
**17.55** «Сямейны дэтэктыў». Серыял.
**20.55, 0.15** «М.У.Р». Серыял.
**22.35, 5.10** «Зоркі і містыка».
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**2.45** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 14.15** «Паганіні: скрыпач д'ябла». Драма.
**8.20, 2.15** «З 5 да 7. Час палюбоўнікаў». Камедыя.
**10.10** «Мацільда». Камедыя.
**12.05, 4.00** «Паўночная краіна». Драма.
**16.20** «Прылады смерці: горад касцей». Фэнтэзі.
**18.30** «Снежань». Драма.
**20.10** «Тату зноў 17». Камедыя.
**22.10** «Эрын Брокавіч — прыгожая і рашучая». Драма.
**0.25** «Хлопчыкі-налётчыкі». Баявік.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.35** «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна». Дэтэктыў.
**8.20, 2.10** «Адмірал». Драма.
**10.30, 4.30** «Дыялогі». Драма.
**12.20** «СВ. Спальны вагон». Драма.
**14.20** «Ключ ад спальні». Камедыя.
**17.00** «9 дзён і адна раніца». Драма.
**20.20** «Поўнае пераўтварэнне». Камедыя.
**22.20** «Паказваючы ахвяру». Камедыя.
**0.20** «Сышчык Пуцілін. Дом спатканняў». Дэтэктыў.

### National Geographic

**6.00, 13.35** Гульні розуму.
**6.50** Узлом Сістэмы.
**7.15, 10.00, 13.10, 14.45, 20.10, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 17.55** Служба выратавання Аляскі.
**8.30, 11.40, 18.40, 21.45, 1.40, 4.45** Аўта-SOS.
**9.15, 14.00, 19.25** Чалавек супраць YouTube.
**10.50** Незвычайныя промыслы.
**12.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**15.30** На плытах па Юкане.
**16.20** Сіла племені.
**17.05** Сакрэтная зброя Японіі.
**21.00, 0.50, 4.00** Сапраўдны суперкар.
**22.30** Уварванне на Зямлю.
**23.20, 2.20** Эвакуацыя Зямлі.
**0.05, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00** Навука магіі.
**9.00, 14.00, 21.30** Як гэта ўстроена?
**9.30, 14.30, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 17.00** Гаражнае золата.
**11.00, 7.10** Рачныя монстры.
**12.00** Праз любоў да машын.
**13.00, 6.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**15.00, 5.30** У пагоні за класікай.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Прыроджаны механік.
**19.00** Хуткія і гучныя.
**20.00** Браты Дызель.
**22.00** Скарбы з каморкі.
**23.00** Паляўнічыя на старызну.
**0.00** Ліквідатар.
**1.00** Багажныя войны.
**2.00, 4.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Гараскоп на

**АВЕН.** Поспех будзе неадрыўна ісці за вамі, так што паспрабуйце як мага больш поўна выкарыстаць гэты шанц і не выпусціць ніякую з прадстаўленых магчымасцяў. Гэта будзе час актыўных дзеянняў і руху, таму не сядзіце на месцы, а выходзьце з дому насустрач прыгодам і новым падзеям. Вас чакаюць змены ў асабістым жыцці і на працы — іх не варта баяцца, а наадварот неабходна прыкласці намаганні для таго, каб атрымаць як мага больш ад гэтых пераменаў. Аднак будзьце абачлівыя ў справах бізнесу, каб хваля захаплення не накрыла вас з галавой, інакш могуць быць не зусім прыемныя наступствы.

**ЦЯЛЕЦ.** Надыходзіць найбольш удалы час для таго, каб адправіцца ў падарожжа або заняцца спортам. Таксама будзьце ўважлівыя да ідэй, якія ўзнікаюць у вас, бо многія з іх змогуць аформіцца ў нешта канкрэтнае і вырашыць некаторыя актуальныя пытанні. Да таго ж на гэтым тыдні з'яўяцца магчымасці самастойна змяніць сваё жыццё да лепшага, але толькі ў тым выпадку, калі будзеце прыслухоўвацца да інтуіцыі і дзейнічаць згодна з падказкамі сэрца. Спрабавць узяць штосьці напорам і тым больш па чужой парадзе бессэнсоўна.

**БЛІЗНЯТЫ.** Пачатак тыдня будзе вельмі эмацыянальным — гэта можа мець як станоўчае, так і адмоўнае адценне. Калі вам здаецца, што справы не ладзяцца і ўсё валіцца з рук, то наступіў момант для таго, каб сабрацца і перастаць скардзіцца. Паспрабуйце цвяроза ацаніць сітуацыю — усё не настолькі жудасна, як вы сабе ўяўляеце, і ўсе праблемы вырашальныя. Хутчэй за ўсё, лепшым варыянтам у гэты перыяд будзе сысці з галавой у працу і разгрэбці назапашаныя справы.

**РАК.** Пачатак тыдня выдасца не вельмі цікавы, вам захочацца сысці ад навакольнага свету, засцерагчы сябе ад шуму і мітусні. У першай палове гэта можа ўдасца. У сярэдзіне тыдня ў вас могуць папрасіць у доўг або, наадварот, папрасіць яго аддаць, у гэтым выпадку не варта адмаўляць, калі такая магчымасць маецца. Асаблівая актыўнасць выявіцца бліжэй да канца тыдня. Захочацца больш рухацца, таму гэты час добра прысвяціць рашэнню нескладаных спраў або актыўнаму адпачынку ў прыемнай кампаніі.

**ЛЕЎ.** У панядзелак і аўторак вы можаце адчуць сябе не ў сваёй талерцы і наогул лішнімі, бо вас ніхто не стане слухаць, а падзеі будуць адбывацца зусім незалежным ад вас чынам. І, магчыма, лепш было б, калі б вы і не спрабавалі ў іх умешвацца. Да сярэдзіны тыдня магчымы канфлікты і непаразуменні з калегамі, хоць да сур'ёзнага разладу яны і не давядуць. Асабліва агрэсіўнымі вы можаце быць у канцы тыдня, калі захочаце скінуць з сябе цяжар мінулага тыдня і сарвацца на блізкіх.

**ДЗЕВА.** Тыдзень будзе вельмі спрыяльным для вас, асабліва ў рамантычнай і сямейнай сферы. У яго пачатку адчуеце сябе цалкам задаволеным жыццём, і можа праявіцца цяга да празмернасцяў. Нязначныя складанасці на працы і шурпатасці ў асабістым жыцці згладзяцца ў сярэдзіне тыдня, у вас з'явіцца здольнасць ураўнаважваць усё, што адбываецца. Канец тыдня спрыяльны для зносін са сваякамі. Могуць нахлынуць прыемныя ўспаміны.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** У панядзелак вы можаце адчуваць эмацыянальны дыскамфорт ад панесеных страт або з-за непрыемнасці, якая з вамі здарылася. Але на самай справе вы перабольшваеце і нічога страшнага не адбылося. Да сярэдзіны тыдня ёсць усе шанцы ўмацаваць сваё матэрыяльнае становішча. Вам нават не трэба нічога для гэтага рабіць, хутчэй наадварот — важна не перашкаджаць, а ўсё складзецца само сабой. Будзьце ўважлівыя да парадаў і чужога меркавання, гэта можа спатрэбіцца ў будучыні.

**СКАРПІЁН.** Удалым тыдзень назваць нельга, хоць з іншага боку ўсё ў вашых руках, і таму негатыўныя сітуацыі вы можаце згладзіць і звесці да мінімуму. З самага пачатку тыдня пачне здавацца, што вас ніхто не шануе і ні ў што не ставіць. Гэта можа сур'ёзна знерваваць і выбіць з каляіны. А пры такім настрої ніякая праца не атрымліваецца, што яшчэ больш пагоршыць сітуацыю. Таму, перш за ўсё, трэба ўзяць сябе ў рукі і дзейнічаць, нягледзячы ні на што, так, як вы лічыце патрэбным.

